Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2014-11-14

# Рарытэты пад апекай

Сумесны беларуска-польскі майстар-клас па кансервацыйнай прафілактыцы папяровага дакумента XX стагоддзя адбыўся ўчора ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Мерапрыемства прызначалася ў першую чаргу для работнікаў архіваў, бібліятэк і музеяў Беларусі, якія займаюцца праблемамі захаванасці фондаў папяровых дакументаў першай паловы XX стагоддзя: гэта архіўныя матэрыялы, кнігі, фотаздымкі, газеты, часопісы, лістоўкі.

Падчас майстар-класа, які праводзіла вядомы эксперт Ганна Чайка, кіраўнік Варшаўскай цэнтральнай лабараторыі кансервацыі архіўных дакументаў, прысутныя даведаліся пра метады распазнання пагроз, характэрных для дакументаў на папяровым носьбіце, якія былі створаны ў перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі. Прадстаўлены найноўшыя еўрапейскія дасягненні ў сферы захавання гэтых рарытэтаў.

**Аляксандр СЦЕФАНОВІЧ**

Аляксандр Сцефановіч. Рарытэты пад апекай